4. Панкина, М.В. Экологический дизайн как интегрирующее содержание профессиональной подготовки дизайнеров и специалистов в области экологического образования / М.В. Панкина, С.В. Захарова // Фундаментальные исследования. – 2012. – № 6-7. – С. 373-377.
5. Пантюк, И.В. Молодежные экологические проекты как способ формирования экологического образа жизни у студентов / И.В. Пантюк // Гуматитарные технологии в образовании и социосфере: сб. науч.ст. / ред.кол. / О.И.Уланович (отв.ред) [и др]. – Минск: Изд.центр БГУ, 2017. – С. 128-133.
6. Программа экологический дизайн и мышление. Schumacher College. – [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.masterstudies.ru/ / Velikobritanija/Schumacher-College/. – Дата доступа: 04.04.2018.

# СЕМАНТЫКА АТРЫБУТАЎ ТРАДЫЦЫЙНАГА БЕЛАРУСКАГА ВЯСЕЛЛЯ: ВЯНОК

# THE SEMANTICS OF THE TRADITIONAL BELARUSIAN WEDDING ATTRIBUTES: WREATH

В. А. Вараб'ёва
V. A. Varabyova

Белорусский государственный университет,
Минск, Беларусь
Belarusian State University
Minsk, Belarus
*e-mail: Voroboa@bsu.by*

---

У артыкуле разглядаецца вясельны вянок дзяўчыны як абавязковы атрыбут вясельнага строю маладой з раскрыццём яго семантычнага і функцыянальнага напаўнення на кожным з этапаў вясельнага абраду.

*Ключавыя словы:* дзявочы вянок; вясельны вянок; ініцыяцыя; вясельны абрадавы комплекс.

The article deals with the wedding wreath of a girl as a mandatory attribute of the bride's wedding costume with the disclosure of its semantic and functional content at each stage of the wedding ceremony.

*Keywords:* maiden wreath; wedding wreath; initiation; wedding ritual complex.

---

Нематэрыяльная культурная спадчына – гэта вялікі абсяг духоўных традыцый народа, яго ведаў, маральна-этычных каштоўнасцей і ідэалаў, зафіксаваных у фальклорных тэкстах і этнаграфічных рытуальна-абра-

давых комплексах. Менавіта ў традыцыйных абрадах сканцэнтраваны светапогляд народа, яго менталітэт, урэгуляваны нормы паводзін, што склала аснову заканадаўчай і прававой культуры.

«Нематэрыяльная культурная спадчына – звычаі, веды і навыкі, традыцыі і звязаныя з імі інструменты, прадметы, артэфакты, прызнаныя грамадствам у якасці культурнай спадчыны. Нематэрыяльная спадчына перадаецца з пакалення ў пакаленне і фарміруе ў грамадства пачуццё самабытнасці і пераемнасці» [1].

Сучаснае грамадства праяўляе сапраўдную цікавасць да народных традыцый. Сучасная мода прапануе строі, упрыгожванні, прадметы хатняга ўжытку з элементамі традыцыйнага аздаблення, з выкарыстаннем традыцыйных сімвалаў і знакаў. Сучасная кухня ўсё часцей звяртаецца да традыцыйных рэцэптаў прыгатавання розных страў і напояў. Расце цікавасць і да традыцыйных абрадавых дзействаў.

На жаль, гэта цікавасць найчасцей тычыцца толькі знешніх праяў і хаатычнага выкарыстання атрыбутаў без уліку іх семантычнага напаўнення. Для спасціжэння духоўнай культуры народа, авалодання яе здабыткамі неабходна глыбокае разуменне кожнага элемента спадчыны ў кантэксце яго функцыянавання і сувязі з іншымі элементамі.

Сямейныя абрадавыя комплексы – гэта той універсальны пласт традыцыйнага жыцця, які не траціць сваёй актуальнасці і сёння. Нараджэнне, шлюб, смерць – асноўныя вехі, праз якія павінен прайсці кожны чалавек. Як раней, так і сёння адзіным абрадам, які можна абмінуць, застаецца шлюб. З другога боку, шлюб застаецца адзіным абрадам, праз які можна прайсці некалькі разоў. Аднак правільна, як лічылі нашы продкі, браць шлюб адзін раз у жыцці. Менавіта на фарміраванне аказнасці за кожнае сваё рашэнне, выказанае словам альбо дзеяннем, паводзінамі, накіраваны ўвесь лад жыцця чалавека і, безумоўна, рытуальна-абрадавы комплекс вяселля.

Традыцыйнае беларускае вяселле з’яўляецца адной з найбольш даследаваных з’яў у беларускай фалькларыстыцы і этнаграфіі. Рытуальна-абрадавы комплекс прыцягвае ўвагу даследчыкаў не толькі сваёй непаўторнасцю і багаццем вербальнага афармлення, але і складанай полісемантычнай напоўненасцю, якая цалкам адпавядае светапогляду нашых продкаў на кожным з этапаў грамадскага развіцця. Вясельны рытуальна-абрадавы комплекс складаецца з трох этапаў: перадвясельнага, вяселля, паслявясельнага.

Вялікая колькасць рытуалаў, якія складаюць перадвясельны этап, дастаткова адцягнены ў часе, каб сфарміраваць у маладых (жаніха і нявесты) устойлівае перакананне прыняцця адно аднаго на эмацыянальна-псіхалагічным узроўні, што павінна прывесці да духоўнай блізкасці і добрых узаемаадносін у сям’і. У іншым выпадку на ранніх этапах (пярэ-

пыты, сватанне, агледзіны, запоіны) можна адмовіцца ад шлюбу. Ганьбай лічылася адмаўленне ад шлюбу толькі пасля заручын, на якіх прызначалі дату вяселля, дамаўляліся пра пасаг, абгаворвалі вясельныя выдаткі і вырашалі розныя гаспадарчыя пытанні.

На кожным з этапаў вяселля вялікая роля адводзіцца атрыбутам, значэнне якіх сакралізуецца. Так, пустая бутэлька пасля запоін насыпаецца жытам, перавязваецца чырвонай стужкай і захоўваецца да вяселля як сімвал багацця і шчасця. Праз увесь абрадавы комплекс праходзіць вянок маладой. Гэта адзін з самых насычаных і складаных сімвалаў вясельнага абрадавага комплексу.

Мэта артыкула – разгледзець шлюбны вянок дзяўчыны як абавязковы атрыбут вясельнага строю маладой з раскрыццём яго семантычнага і функцыянальнага напаўнення на кожным з этапаў вясельнага абраду.

Вясельны абрадавы комплекс ахоплівае даволі працяглы перыяд часу: мы сустракаем дзяўчыну ў карагодзе моладзі, і хлопец пазнае яе па дзявочаму, «пярловаму» вянку:

Выбраў сабе дзевачку
У вішнѐвым садочку,
У пярловым вяночку [3, с. 31].

Дзявочы вянок застаецца на выбранніцы аж да заручын, калі

Ясенька вяночка здымае,
Коніку на грыву ўкладае.
У коніка грыўка плецена,
Ганулька з Ясенькам злучана [3, с. 214].

Заручыны – гэта мяжа: «заручоная і запітая» дзяўчына ўжо не мае права насіць дзявочы вянок. Менавіта з заручын і пачынаецца ініцыяцыя дзяўчыны, яе пераход у новае жыццё.

Ініцыяцыя прадугледжвае заканчэнне аднаго этапу жыцця і пачатак новага з абавязковым змяненнем семантыкі сацыяльных і сямейных сувязей, іх новую атрыбуцыю пры ўмове незваротнасці адмоўленага стану і статусу. Для дзяўчыны такое адмаўленне носіць больш істотны характар, чым для хлопца: яна пакідае сям’ю сваіх бацькоў, незамужніх сясцёр і братоў і рыхтуецца стаць прадстаўніцай іншага роду, носьбітам традыцый і звычаяў роду свайго мужа. Падкрэсліваецца незваротнасць гэтага стану: дзяўчына ніколі не зможа вярнуцца ў сям’ю сваіх бацькоў, яна выключана з яе назаўсёды.

Вясельная ініцыяцыя дзяўчыны – гэта рытуальная смерць у адной якасці (прадстаўніцы роду бацькоў) і нараджэнне ў новай (прадстаўніцы роду мужа). Пераход мае глыбока сакральны характар і перадаецца праз

адпаведнае атрыбутыўна-рэчыўнае напаўненне. Сакральныя атрыбуты маюць строга вызначаную паслядоўнасць і фарміруюць логіка-семантычную сістэму пераходу праз комплекс візуальных, аудыяльных, тактыльных рытуалаў, якія ў спалучэнні з вербальнымі тэкстамі маюць на мэце стварэнне эмацыянальна-псіхалагічнага стану з прыняццем завершанасці аднаго шляху і пачатку новага.

У якасці аднаго з сакральных атрыбутаў пераходу дзяўчыны фігуруе елка. Згодна з запісамі XIX стагоддзя, на двары дзяўчыны-маладой ставілася елка як сімвал яе адыходу з гэтай хаты ў новае жыццё [6]. Як зазначае П.В. Шэйн, «елку ставілі не на ўсіх вяселлях, але там, дзе яе рабілі, ёй сапраўды надавалі магічную ролю, упрыгожвалі і ставілі на стол…нявеста запрашала на «елку» дзяўчат. Яны ж спачатку упрыгожвалі каснікамі, стужкамі, папяровымі кветкамі галаву нявесты, а потым вілі «елку», прымацоўвалі папяровыя кветкі, саламяныя крыжыкі, свечы і іншае пад спевы дзяўчат:

А вілі мы елачку на сяле,
Паставілі ў татачкі на стале.
Так наша елка на стале
Як золат персцень на руцэ,
Так нашу елачку шануюць,
Як золат персцень шаруюць» [7, с. 298].

І хоць сам даследчык не звязваў вобраз елкі з рытуальнай смерцю дзяўчыны, яе ініцыяцыяй-пераходам, лічым, што прыведзены ім прыклад выразна ілюструе іменна гэту ідэю.

Прыгадаем, яловымі лапкамі высцілалі шлях нябожчыка, каб яго пераход быў лёгкім. «Ельцам» называлі і ўпрыгожванне вясельнага караваю, зробленае з галінкі яблыні. Яблыня – сімвал плоднасці, але зычылі плоднасці дзяўчыне толькі ў новым жыцці, пасля «ельца». Рытуал слёзнага плачу-развітання дзяўчыны з роднымі і вяскоўцамі, якія прыходзяць да хаты маладой перад яе ад’ездам да вянца, таксама семантычна суадносіцца з развітаннем падчас пахавання. Заўважым, што рытуалы пахавання носяць сімвалічны характар, як і сама смерць: цалкам адсутнічае матыў «жалобнай дарогі». Ён перакрываецца матывам дарогі-нараджэння, шчаслівай дарогі ў новае жыццё. Паказальна, што бацькі маладой у новую дарогу-нараджэнне дачку не суправаджаюць, іх прывозяць у новую хату маладой на наступны дзень, пасля першай шлюбнай ночы, калі маладая фізічна стала прадстаўніцай новага роду, жонкай.

Завіванне елкі адпавядае перыяду, калі дзяўчына застаецца без дзявочага вянка:

Дзевачкі сядзяць, вяночкі дзяржаць,
Мяне не прымаюць.
Жаночкі сядзяць, сыночкаў дзяржаць,
Мяне падзываюць» [3, с. 113].

Памежнае становішча дзяўчыны ў гэты перыяд цалкам суадносіцца з патрабаваннямі ініцыяцыі, да таго ж у песнях выразна паказана перспектыва дзяўчыны ў новым нараджэнні – жанчына-маці. І гэты новы статус яна набудзе у працэсе вяселля.

«Суборная субота» («Дзявочы вечар») – этап, на якім рыхтуецца вясельны ўбор маладой. Упершыню з'яўляецца вясельны вянок. Ён прызначаны для заключэння шлюбу і можа называцца вянчальным. Такі вянок плятуць сяброўкі-дзяўчаты для маладой. У якасці вянчальнага вянка можа фігураваць вянок з «калючага яленцу»:

Суборная суботачка настала,
Млода Ганначка ўсіх дзевачак сабрала,
А сабраўшы, у радочак саджала.
Сама села ўсіх дзевачак найвышэй,
Схіліла галовачку ўсіх дзевачак найніжэй:
–Вы, дзевачкі, вы, сястрыцы вы мае,
А вы звіце два вяночкі мне й сабе.
Сабе звілі з руты, з мяты, з лілеі,
А мне звілі з калючага яленцу.
Яленец коліць, галоўку клоніць да зямлі –
Адлучаецца млода Ганначка ад сям'і [2, с. 255-256].

«Такі вянок «адлучае» і «прылучае», гэта значыць, звязвае сабой момант пераходу дзяўчыны з адной якасці ў другую» [4, с. 78] і па сваёй сутнасці з'яўляецца ініцыяльным.

У беларускіх вясельных песнях часта сустракаецца падрабязнае апісанне вянчальнага вянка з пералікам тых кветак, якія ў ім павінны быць. Так, дзяўчына просіць сяброван:

Усялякія краскі рвіце,
Мне, маладой, да вянок віце:
Да і з руты, і з мяты,
І з шалвеі, і з ялеі,
Да і з жоўтага кракосу
Да ў маю да ў русу косу [2, с. 214].

«Рута, мята, шалфей...— у народнай паэзіі сімвалы дзявоцкасці, строгасці нораваў, жаночай непадатлівасці», – піша М. Кастамараў

[4, с. 152]. Гэтыя вобразы «маюць сэнс захавання чысціні» [5, с. 152]. Дзяўчына, якая не захавала сваю чысціню да шлюбу, не мела права ўплятаць у вянок гэтыя краскі. Наборам кветак у вянчальным вянку ўслаўляцца і дзяўчына, і сям'я, у якой яна расла:

Што я вас буду, мае дзевачкі, прасіці:
Хаця ж вы мне з руты вяночак савіце.
Я заўтра буду ў таты на куце сядзеці,
На мяне будуць усе людзі глядзеці [2, с. 205].

Вянчальны вянок – своеасаблівая характарыстыка маладой. Па ім даецца ацэнка дзяўчыне роднымі маладога, фарміруюцца адносіны да нявесткі з боку бацькоў хлопца.

Пасля шлюбнай ночы вянок урачыста здымаецца з галавы маладой і завязваецца хустка. Маладая жанчына лічыцца прынятай у новую сям'ю і разам са статусам атрымлівае і новыя абавязкі.

Ведаць змест традыцый, семантыку вобразаў павінен кожны, хто займаецца адраджэннем культурнай спадчыны народа. Толькі правільнае разуменне механізмаў стварэння таго ці іншага вобраза, знака, сімвала, іх функцыянавання ў традыцыйнай прасторы і часе прывядзе да новых якасных дызайнерскіх распрацовак, увасобленых у арыгінальных аўтарскіх праектах, цікавых і карысных для ўдзельнікаў сучаснага культурнага працэсу.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. Белорусский экскурсионный портал [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://ekskursii.by/?Nematerialnoe_kulturnoe_nasledie_Belarusi. – Дата доступу: 09.12.2018.
2 Вяселле. Песні. У 6 кн. – Кн. 2. / Склад. Л.А. Малаш; муз. дадатак З.Я. Мажэйка; рэд. М.Я. Грынблат, А.С. Фядосік. – Мінск: Навука .і тэхніка, 1981. – 831 с.
3. Вяселле. Песні. У 6 кн. – Кн. 3. / Склад. Л.А. Малаш; муз. дадатак З.Я. Мажэйка; рэд. М.Я. Грынблат, А.С. Фядосік. – Мінск: Навука .і тэхніка, 1983. – 768 с.
4. Гарбачонак, С. Семантыка вянка ў беларускіх вясельных песнях / С. Гарбачонак, В. Сухая // Фальклорыстычныя даследаванні. Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі: Зб. арт. – Мінск: Бестпрынт, 2004. – С. 75—81.
5. Костомаров Н. И. Славянская мифология. Исторические монографии и исследования. – М.: Чарли, 1994. — 688 с.
6. Никольский, М.Н. Происхождение и история белорусской свадебной обрядности / Н.М. Никольский [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.twirpx.com/file/1615660/. – Дата доступу: 09.12.2018.
7. Шейн, П.В. «Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П.В. Шейн. – Том 2 – Ч.1. – СПб., 1893. – 751 с.